# IV фінальны этап XVII Рэспубліканскай галіновай круглагадзічнай спартакіяды работнікаў сувязі

IV фінальны этап XVIII Рэспубліканскай галіновай спартакіяды спецыялістаў сувязі 2016 года адбыўся 19-21 жніўня 2016 года на базе ДАЛ «Крынічка» РУП «Белтэлекам» з выкарыстаннем спартыўных пляцовак горада Мінска.

У спаборніцтвах прынялі ўдзел 6 каманд: РУП «Белтэлекам», РУП «Белпошта», СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы», ААТ «Белсувязьбуд», РУП «БелДІЭ», УП «Вэлком».

Урачыстае адкрыццё і закрыццё спартакіяды праходзіла ў момант правядзення XXXIлетних Алімпійскіх гульняў ТБ РЫА-21016 на ўздыме: з вынасам факела алімпійскага агню, з удзелам артыстаў і спартсменаў.

Сярод ганаровых гасцей - міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Папкоў Сяргей Пятровіч, прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, кіраўнікі арганізацый сувязі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі.

На працягу трох дзён каманды спаборнічалі ў дзевяці відах спорту: валейболе сярод мужчынскіх і жаночых каманд, міні-футболе, настольным тэнісе, гіравым спорце, лёгкаатлетычным кросе, дартсе, більярдзе, стральбе, плаванні. У зводны пратакол былі ўключаныя вынікі спаборніцтваў па лыжных гонках, якія адбыліся 27 студзеня 2016 года.

У прыгожай і ўпартай барацьбе, з актыўнай падтрымкай заўзятараў камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам:

У валейболе сярод мужчынскіх каманд:
I месца - СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы»,
II месца - ААТ «Белсувязьбуд»,
III месца - РУП «БелДІЭ».

У спаборніцтвах па валейболе сярод жаночых каманд:
I месца - РУП «Белтэлекам»,
II месца - РУП «Белпошта»,
III месца - СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы».

Спаборніцтвы па міні-футболе праходзілі не менш відовішчна і часам не проста на футбольным стадыёне ФАК «АТЛАНТ». У выніку:
I месца - РУП «Белтэлекам»,
II месца - РУП «Белпошта»,
III месца - СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы».

У спаборніцтвах па лёгкаатлетычным кросе самай хуткай апынулася каманда РУП «Белтэлекам». Другое месца заняла каманда РУП «Белпошта». З добрым вынікам каманда СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» ўзяла трэцяе месца.

У плаванні лідзіравалі спартсмены РУП «Белтэлекам», прызёрамі сталі плыўцы каманды СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» (2-е месца) і РУП «Белпошта» (3-е месца).

Майстры малой ракеткі парадавалі заўзятараў азартам барацьбы і прыгожымі розыгрышамі:
I месца - РУП «Белтэлекам»
II месца - СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы»
III месца - РУП «Белпошта».

У дартсе сама меткай апынулася зборная каманда УП «Вэлком». Другое месца заваявала зборная каманда РУП «Белпошта». Трэцяе - каманда РУП «Белтэлекам».

У гіравым спорце першынство ўзяла каманда РУП «Белтэлекам». На другім месцы размясціліся асілкі СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы», на трэцім РУП «Белпошта».
У спаборніцтвах па більярдзе: 1 месца ў РУП «Белтэлекам», 2-ое - ААТ «Белсувязьбуд», 3-е - УП «Вэлком».
Па выніках кулявой стральбы тройку лідэраў ўзначалілі: спаборніцтвах па стральбе: РУП "Белтэлекам" - 1 месца, РУП «БелДІЭ» - 2-ое месца, РУП «Белпошта» - 3-е месца.
У выніку напружанай барацьбы, па выніках IV этапу XVIII Рэспубліканскай галіновай спартакіяды спецыялістаў сувязі 2016 года пераможцамі і прызёрамі ў агульнакамандным першынстве сталі:
I месца - РУП «Белтэлекам»,
II месца - СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы»,
III месца - РУП «Белпошта».
У намінацыі «Яркі спартыўны дэбют» агульнае прызнанне атрымалі:
Парахоўская Яна - спецыяліст УП «Велком» - 1-е месца ў спаборніцтвах па плаванні,
Бардыленка Максім, майстар сувязі, кабельшчыка ААТ «Белсувязьбуд» - 2-е месца ў спаборніцтвах па плаванні.
Усім пераможцам, прызёрам і ўдзельнікам спартакіяды новых перамог і здзяйсненняў!

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/24-08-2016-1065*